№40

# ПАЭЗІЯ БЕЛАРУСКІХ АЎТАРАЎ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

**В.Вітка** – класік беларускай літаратуры. «Дударык», «Чытанка-маляванка», «Ладачкі-ладкі» — гэта зборнікі песенек-гульняў, казачак і баек, лічылак і загадак, жартаў і пацешак. У гэтых кнігах аўтар паспяхова развівае ўстойлівую ў беларускай літаратуры фальклорную традыцыю, якая наогул з'яўляецца асаблівасцю творчасці сучасных беларускіх паэтаў, што пішуць для малых. Вітка пастараўся ажыццявіць сваю запаветную задуму: далучыць дзяцей да скарбаў народнай мовы. "Ёсць словы, якія хочацца бясконца паўтараць, – пісаў ён. – Яны самі завучваюцца, бо гэта вясёлыя словы, іх мы любім змалку".

Першая кніжка для дзяцей - казка **"Ваверчына гара"**(1948г ) адразу палаліла сэрцы дзяцей. Твор з першых радкоў захапляе дзяцей, стымулюе іх увагу і эмоцыі, чытачы (слухачы) шчыра спачуваюць ваверачцы, кранае іх тое, як усхвалявала яе гора ўсіх лясных жыхароў, як ласкава, уважліва аднесліся да бяды ваверачкі яе дзеці. Чытаючы казкі Віткі, адчуваеш, што ён творыць мову , як музыку; здзіўляе бязмежная фантазія паэта, арыгінальныя казачныя сітуацыі. У казцы "Ваверчына гара" ачалавечаны не толькі звяры і птушкі, а нават маланка, гром, дождж.

| | **"Азбука Васі Вясёлкіна" (1965г)** | **"Коця і Каця"** | **"Сяброўкі"** |
|---|---|---|---|
| Забалелі ў вавёрачкі зубкі,<br>Не можа раскусіць арэхавай шкарлупкі.<br>Сабралася ўся вавёрчына радня.<br>Думаюць, гадаюць усю ноч да дня:<br>Як тут быць,што рабіць?<br>❖<br>"Нам загадала мама,<br>Каб вы паслалі з маланкай<br>Нашу тэлеграму".<br>- З маланкай? - здзівіўся дзяцел. -<br>А дзе ж яе ўзяці?<br>Не працуе бесперастанку<br>У мяне на пасылках маланка.<br>Бывае і яна выхадная. | Рашыў Вясёлкін Вася:<br>- Сам адкрываю школу.<br>Збіраю ў першым класе<br>І птушак, і жывёлу,<br>Усіх звяроў на свеце.<br>І вы прыходзьце, дзеці.<br>❖<br>- Буквар мы пачынаем з А,<br>І я заўважыць мушу:<br>Не вельмі цяміць галава,<br>Хоць і даўгія вушы.<br>Хапае слоў апроч асла,<br>Што пачынаюцца на А. | Плача коця на кухні,<br>Ад слёз вочкі папухлі.<br>— Што з табою, мой каток,<br>Забалеў мо жываток?<br>— Мяў, — сказаў варкоцік, —<br>Не баліць жывоцік.<br>У мяне душа баліць —<br>Як цяпер на свеце жыць?<br>Як мне жыць у хаце,<br>Калі хлусіць Каця:<br>Смятану злізала —<br>На мяне сказала. | Хто там грукае ў акно?<br>Гэта вы, сінічкі?<br>Я прачнулася даўно,<br>Запляла касічкі.<br>Вось надзену кажушок,<br>Выбегу на ганак,<br>З лесвіцы смяту сняжок,<br>Вынесу сняданак. |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**М. Танк** у сваіх творах для дзяцей выказвае захапленне фальклорнымі скарбамі нашага народа, імкнецца выклікаць гонар за сваю Бацькаўшчыну. Творчае выкарыстанне набыткаў беларускага казачнага эпасу адчуваецца ў такіх творах М.Танка, як "Журавель і чапля"(1945), "Жук і слімак". Гэтыя казкі – не спрошчана-прымітыўны пераказ вершамі фальклорных твораў, а з'ява арыгінальная, высокамастацкая. Талент М.Танка як дасканалага майстра літаратурнай апрацоўкі выявіўся і ў яго творы "Конь і леў" (1953). Вядома, што дзецям падабаюцца казкі пра жывел, яны любяць, каб у творах былі дыялогі, элементы сцэнічнасці. Перапрацаваўшы фальклорны сюжэт, пісьменнік, па сутнасці, стварыў невялічкую п'есу паводле зместу беларускай народнай казкі "Як конь стаў старэйшым ад льва".

**"Журавель і чапля"**

На адным канцы балота
Была хата Жураўля,
На другім канцы балота
Чапля шэрая жыла.
Надакучыла сівому
Жыць самотна Жураўлю…
Вось задумаў ажаніцца
Ды на Чаплі Журавель
І пайшоў да маладзіцы
Па імшарах, па дрыгве…

**"Жук і слімак"**

Пагожым летнім ранкам
На лузе за сялом
Сустрэўся жук аднойчы
З рагатым слімаком.
- Здарова! - жук вітае. -
Куды, браток, ідзеш
І з ракавіны хатку
Куды з сабой нясеш? -
Абцёр слімак пот з твару,
Гаворыць так жуку:
- Нямала перажыць мне
Прыйшлося на вяку…

**"Конь і леў"**

Працаваў буланы Конь
У гаспадара,
З году ў год вазы вазіў
І зямлю араў.
А калі ён пастарэў
Ды нядужым стаў,
Гаспадар яго з двара
Праганяць пачаў…
Ён ідзе, мурог скубе,
Ліст духмяны з дрэў.
Раптам бачыць: перад ім
Сам магутны Леў…

**"Галінка і верабей"**

- Галінка-вярбінка, - прасіў верабей, -
Мо пакалыхала б маіх ты дзяцей?
Галінка не хоча дзяцей калыхаць.
- Ідзіце, казулі, галінку ламаць!
Казулі не хочуць.
- Ідзіце, ваўкі, лавіці, караці
Казуляў такіх,
Якія не хочуць
Галінку ламаць,
Якая не хоча
Дзяцей калыхаць…

**С. П. Шушкеві.** У асноўным пісаў для дзяцей дашкольнага и малодшага школьнага ўзросту. Яго творы увабралі лепшыя традыцыі беларускага, у тым ліку і дзіцячага фальклору не толькі у сэнсе выкарыстання вобразна-выяўленчых сродкаў, а і ў плане сцвярджэння народных ідэалаў дабра, справядлівасці, прыгажосці. Творы Шушкевіча аптымістычныя па гучанні і змесце, яны прыносяць дзецям радасць, выхоўваюць у іх дабрыню, спагадлівасць, любоў да роднай зямлі.

Ен аўтар кніжак вершаў, апавяданняў і казак для дзяцей «Звярыны баль» (1936), «Лясная калыханка» (1958), «Сарочы церамок» (1959), «Мы на змену ідзём» (1961), «Гара Марата Казея» (1963), «Будзільнік» (1966), «Апавяданні пра Марата Казея» (1968, 1988), «Вясёлыя дзятлікі» (1970), «Колькі кіпцікаў у кошкі» (1972), «Дванаццаць пасланцоў» (1973), «Барадаты камар» (1977), «Красавік» (1977), «Ліса з магнітафонам» (1979), «Казачны церам» (1983), «Едзе страшная Яга» (1985), «Казёл на верталёце» Чытаючы дзіцячыя вершы С.Шущкевіча, адчуваеш, што сюжэты многіх з іх узяты з жыцця, падказаны канкрэтнымі выпадкамі, асабістымі ўражаннямі.

Сваімі творамі С.Шушкевіч вядзе дзяцей да пазнання новага, дае магчымасць адчуць, колькі навокал цікавага, загадкавага, колькі красы ў роднай прыродзе. С.Шушкевіч клапаціўся, каб дзеці не толькі вучыліся бачыць прыгожае ў прыродзе, але і сталі яе сапраўднымі сябрамі, каб усвядомілі, што прырода – багацейшы скарб Бацькаўшчыны, якім неабходна даражыць. Гэта вельмі важна, бо ад сяброўства з прыродай, ад любові, беражлівых адносін да яе пачынаецца пачуцце Радзімы.

**"Цяжка жабцы жыць без хаты"**

Жабка кумкае на кладцы:
- Вунь бабры жывуць у хатцы,
А на беразе, на горцы,
Крот у цёмнай, цёплай норцы,
А зусім жа недалёка
Мае дом-гняздо сарока.
Мне ж няма дзе прытуліцца…

**"Пракалоў камарык ножку"**

Пракалоў камарык ножку
Аб паломаную дошку.
Нясе маці сына ў хату,
Дастае бінты і вату.
— Куды ж цябе ліха нанесла?
Ну сядай, сынок, у крэсла!
Будзем ножку бінтаваць,
Рану ёдам заліваць…

**"<u>Нашы сябры</u>"**

Снегіры, сінічкі! Сыплю вам пшанічкі,
Крупак, крошак хлеба, вам жа мала трэба!
Еште, любыя сябры! Не ляціце у бары,
А жывіце у двары да вясновае пары.
Вось для вас кармушкі,
Птушкі-шчабятушкі,
Нашы весялушкі!

**"Пайшоў коўзацца каток"**

Пайшоў коўзацца каток на рачулку, на лядок.
Як імчаўся, на хаду праваліўся у ваду.
Замачыў ён чаравічкі, і касцюм, і рукавічкі.
Нетрывалы быў лядок, непаслушны быў каток.
А яму ж казала маці, каб лавіў мышэй у хаце,
Каб маленькіх калыхаў і на печы цёплай спаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Эдзі Агняцвет**. Тэматыка вершаў разнастайная, пісала пра ўсе праявы дзіцячага жыцця. На раннім этапе творчасці значную ўвагу, як і ўсе паэты таго часу, надае грамадзянскай лірыцы. Паэтка адкрывала дзецям свет людзей, што ў час вайны здзяйснялі подзвігі (паэмы "Песня пра вытараваны сцяг" і "Будзем сябраваць"). Паэтызацыя Радзімы, прыгажосці роднага краю таксама характэрна для паэзіі Э.Агняцвет. Запамінаюцца вершы "Рэчанька, рэчанька мая", "Дудка", "Лыжнікі". У кожным творы паэтэсы раскрываюцца цуды прыроды, яе разнастайнасць, але галоўнае ў тым, што яна падштурхоўвае чытача заўважаць гэтую прыгажосць, цаніць яе. Актыўнае ўзаемадзеянне з прыродай гартуе дух маладога пакалення. З вершаў так і струменіць заклік не паддавацца паныласці, жыць у адпаведнасці з запаветамі продкаў. Паэзіі Агняцвет уласціва выяўленне як грамадзянскага пафасу, так і чыста бытавога, нават прыземленага, паўсядзеннага. У гэтым аспекце цікавымі выглядаюць вершы на гумарыстычную і сатырычную тэму ("Свісток"). Паэтэса здолела ўбачыць надзвычайныя рысы дзяцей, якія адразу вызначылі характары дзеючых асоб..

| ЗЯМЛЯ З БЛАКІТНЫМІ ВАЧАМІ | ГРАМАЦЕІ | "Саўка за сталом" | "ДУДКА" | "Параска і падказка" |
| --- | --- | --- | --- | --- |
| Зямля з блакітнымі вачамі -<br>Раздолле рэчак і лугоў!<br>Тут называюць Васількамі<br>На Беларусі хлапчукоў,<br>Звіняць крыніцы, як цымбалы,<br>Сцяжынкі свецяць у лясах.<br>Палі, узгоркі, перавалы -<br>Прасторны шлях, далёкі шлях! | Саня – першы грамацей,<br>А за ім ідзе Мацей.<br>Саня піша:<br>«Роўна ў восім<br>На футбол з'явіцца просім».<br>– Непісьменная аб'ява,<br>Класу нашаму – няслава! | Ляжаць ля талеркі відэлец і нож.<br>Дзве чыстыя лыжкі ляжаць.<br>- Ну і што ж?<br>Ляжаць – хай ляжаць, іх не буду чапаць.<br>Яны ж не чапаюць мяне і маўчаць.<br>З талеркі ён сёрбае крупнік – ой-ой!<br>Кавалачак мяса хапае рукой.<br>Ён пальцамі ловіць у шклянцы кампот,<br>Абрусам ён выцер і шчокі і рот. | Мы з дзедам дудку змайстравалі,<br>Яна зайграла на зары,<br>Музычнай казкаю назвалі<br>– Прыходзьце, слухайце, сябры!<br>Сініцы, берасцянкі быццам<br>З акенца дудачкі ляцяць.<br>А як паклічу я крыніцы,<br>– Галаснікі аж зазвіняць!<br>І над усёй зямлёй, здаецца,<br>Вясёлка звонкая ўзышла.<br>Жывое мае дудка сэрца<br>– Для песень шчырых і святла. | Скажы, Параска, калі ласка,<br>Якую ты чытала казку? Параска думае: «Ой, ой,<br>Я ж не чытала ні адной!» Хтось шэпча ў класе: — Курка Раба…<br>Параска кажа: — Мурка-жаба.<br>Хтось шэпча: — Журавель і чапля.<br>— Я помню: «Муравей і шабля». |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ